Суша М.

# ПОДЗВІГ ХВЯДОСА СМАЛЯЧКОВА

Чатырнаццацігадовым хлопчыкам Хвядос Смалячкоў адправіўся са сваёй роднай вёскі Чырвоная Слабада, што на Быхаўшчыне, у Ленінград вучыцца на муляра.

Непрыкметна прайшоў час вучобы ў школе ФЗН. Смалячкоў стаў звеннявым муляраў і хутка заваяваў першынство на будоўлі. Ужо тады ўсім, хто працаваў з ім побач, кідалася ў вочы яго настойлівасць і рашучасць.

Яшчэ ў школе Хвядос быў ама тарам спорту, лепшым стралком. І ў горадзе ён не закінуў гэты занятак – паступіў на снайперскія курсы Асаавіяхіму.

У дзённіку Смалячкова, які ён вёў у Ленінградзе, ёсць такі запіс ад 15 лютага 1941 года:

"Ітак, таварыш Смалячкоў, віншую Вас з заканчэннем снайперскіх курсаў!" Сказаўшы гэта, старшы лейтэнант моцна пацiснуў мне руку і па-сяброўску дадаў: "Жадаю табе, Федзя, удачы...".

Неўзабаве пачалася вайна. Вораг набліжаўся да Ленінграда. Усе ленінградцы, хто мог трымаць зброю, сталі на абарону роднага горада. Хвядос Смалячкоў уступіў ў рады апалчэнцаў, а крыху пазней пайшоў на фронт.

Воіны займалі абарону на Пулкаўскіх вышынях. У тыя дні Смалячкоў стаў стралком-снайперам.

У засаду пайшлі ўдваіх – Смалячкоў і Шушкін.

Марудна цягнецца час у засадзе. Ляжыш гадзіну, другую – і ні душы. Нарэшце, з варожага дзота вытыркнулася каска. Хвядос праверыў прыцэл, стаіў дыханне. Націск на курок, і ляснуў стрэл.

– Ёсць адзін, – шапнуў Хвядос таварышу.

– Будзе і другі, – ціха адказаў той.

Тры забітыя фашысты – такі рахунак баявога дня снайпера Смалячкова. А ўвечары таго дня байцы-таварышы прынялі Хвядоса ў камсамол. Тады ён і заявіў:

– Кожная куля, выпушчаная з маёй вінтоўкі, будзе біць па ворагу!

З дня ў дзень Хвядос Смалячкоў хадзіў у засаду. І заўсёды ўдала. У студзені 1942 года на яго рахунку было 107 забітых фашыстаў.

Захавалася запісная кніжка снайпера Аляксея Зібрава, які быў пасля смерці Шушкіна Хвядосавым напарнікам. У ёй ёсць цікавыя запісы:

"Выйшлі ў 6 раніцы. Выбраліся за баявую ахову і за дрот. Знішчылі 7. З іх аднаго забіў я – Зібраў".

"Сёння ў 6 раніцы былі на старым месцы. Падышлі яшчэ бліжэй да варожых траншэй. Знішчылі 6. Двух забіў я – Зібраў".

"Зямлянку пакінулі ў 6 раніцы. Цэлы дзень правялі ў хляве, вялі назіранне. Мінамёты і гарматы фашыстаў білі па нашаму пярэдняму краю. Знішчылі 5. На рахунку Зібрава – 0".

"Фашысцкі кулямёт стракатаў за хлявом. Федзя знішчыў 6. Мароз быў 36 градусаў".

Пра снайпера Смалячкова разнеслася слава па ўсім фронце.

"Бі без промаху! Па адной кулі на фашыста!" – з такім заклікам звярнуўся воін-камсамолец да ўсіх байцоў Ленінградскага фронта. Аб яго снайперскім майстэрстве пісалі франтавыя газеты. У яго знайшлося шмат паслядоўнікаў – Іваноў, Волкаў, Лугоўскі, Хобзаў, Палубан і многія-многія іншыя героі-патрыёты першых дзён Айчыннай вайны.

Хвядос Смалячкоў зрабіў 126 выстралаў, знішчыўшы 125 гітлераўцаў.

19 студзеня 1942 года абарвалася жыццё маладога воіна-патрыёта. Верныя таварышы, рызыкуючы жыццём, вынеслі з бою Хвядоса Смалячкова і пахавалі з воінскімі ўшанаваннямі.

– Клянуся тут, на магіле тваёй, дарагі дружа, што адпомшчу ворагу за тваю смерць, за кроў і слёзы майго народа, – прачула гаварыў снайпер Сталяроў, якому перадалі вінтоўку № 13914, што належала загінуўшаму герою.

У лютым 1942 года беларускаму хлопцу-камсамольцу Хвядосу Смалячкову, які смерцю мужных загінуў пры абароне Ленінграда пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Савецкі народ шануе памяць героя. У Ленінградзе ёсць вуліца імя Смалячкова. Яго імя нося піянерская дружына 121-й школы горада Леніна, а таксама пасёлак на Карэльскім перашыйку.

У Магілёўскім абласным краязнаўчым музеі ўстаноўлены бюст героя, створаны беларускім скульптарам, народным мастаком БССР З. Азгурам.

**Суша, М. Подзвіг Хвядоса Смалячкова / М. Суша // Маладосць. — 1958. — № 8. — С. 129—130.**